Парламенцкі дзённік

# АБАРОНА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ І СПАЖЫЎЦОЎ

## Шэраг дакументаў разгледзелі на чарговым пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў

**Змяненні чакаюцца ў заканадаўстве аб меліярацыі земляў, дарожным руху і абыходжанні з адходамі — адпаведныя законапраекты дэпутаты адобрылі ў другім чытанні. Таксама парламентарыі ратыфікавалі шэраг міжнародных пагадненняў і пратакол. Наша краіна спыняе ўдзел у Групе дзяржаў супраць карупцыі (ГРЭКО). Такое рашэнне прынята з мэтай забеспячэння нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь.**



Фота БелТА.

### НЕПАТРЭБНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Праект Закона «Аб спыненні міжнародных дагавораў па пытаннях барацьбы з карупцыяй», разгледжаны ў адным чытанні, прадугледжвае дэнансацыю Беларуссю Канвенцыі аб крымінальнай адказнасці за карупцыю, Дадатковага пратакола да Канвенцыі, спыненне дзеяння Пагаднення адносна прывілегій і імунітэтаў, а таксама прызнанне страціўшымі сілу законаў нашай краіны, якімі гэтыя міжнародныя дагаворы ратыфікаваны Рэспублікай Беларусь. Анулююцца абавязацельствы па прадастаўленні прадстаўнікам членаў ГРЭКО і членам інспекцыйных груп гэтай міжнароднай арганізацыі прывілеяў і імунітэтаў, накіраваных на стварэнне спрыяльных умоў для іх работы на тэрыторыі нашай дзяржавы.

ГРЭКО — гэта міжнародная арганізацыя, асноўнай мэтай якой з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці яе членаў у супрацьдзеянні карупцыі па сродках узаемнай ацэнкі выканання прынятых абавязацельстваў у гэтай галіне. ГРЭКО ўстанаўлівае антыкарупцыйныя стандарты дзейнасці дзяржаў і кантралюе адпаведнасць практыкі гэтым стандартам шляхам правядзення маніторынгаў.

Як адзначыў **генеральны пракурор Андрэй ШВЕД**, у нашай краіне праведзены чатыры раўнды ацэнкі ГРЭКО, па выніках чаго складзены справаздачы і дадзены рэкамендацыі па ўдасканаленні нацыянальнага заканадаўства і практыкі барацьбы з карупцыяй. Па яго словах, Генеральная пракуратура ва ўзаемадзеянні з іншымі зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі прыкладала максімальныя намаганні па выкананні дадзеных рэкамендацый і накіроўвала адпаведную інфармацыю ў выканаўчы камітэт ГРЭКО. «Аднак многія рэкамендацыі насілі палітычны характар і патрабавалі ўнесці змяненні ў Канстытуцыю і нацыянальнае заканадаўства нашай краіны, што з'яўляецца непрымальным, — падкрэсліў Андрэй Швед. — Напрыклад, частка патрабаванняў прадугледжвала абмежаванне або адмену некаторых паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ад нас патрабавалі змяніць заканадаўчыя акты, якія рэгламентуюць дзейнасць праваахоўных органаў і органаў выканаўчай улады. Варта адзначыць, што ГРЭКО нашы довады аб немагчымасці рэалізацыі гэтых патрабаванняў не ўспрымала, пастаянна крытыкавала нашу краіну за нездавальняючы ўзровень выканання, па іх меркаванні, рэкамендацый».

На думку **члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Андрэя ГАНЧУКА**, палітычныя патрабаванні, якія паступалі ад ГРЭКО, выходзяць за рамкі паўнамоцтваў гэтай міжнароднай арганізацыі і з'яўляюцца ўмяшальніцтвам ва ўнутраныя суверэнныя справы Рэспублікі Беларусь. «Як ідуць справы ў барацьбе з карупцыяй у іншых краінах — удзельніцах ГРЭКО (напрыклад, краінах Прыбалтыкі, у Польшчы і ва Украіне), мы таксама добра ведаем — двайныя стандарты, — звярнуў увагу дэпутат. — Разам з тым Беларусь не адмаўляецца ад міжнароднага супрацоўніцтва не толькі па антыкарупцыйным заканадаўстве, але і па любым іншым, але пры ўмове, што такое супрацоўніцтва будзе насіць партнёрскі і ўзаемавыгадны характар. Што датычыцца міжнароднага супрацоўніцтва ў рамках антыкарупцыйнага заканадаўства, то Рэспубліка Беларусь працягне яго ў рамках Канвенцыі ААН па барацьбе з карупцыяй, якую наша краіна ратыфікавала ў 2004 годзе».

### СУПРАЦЬДЗЕЯННЕ НЕЗАКОННАЙ МІГРАЦЫІ

Адпаведныя змяненні закрануць умовы знаходжання замежных грамадзян на тэрыторыі нашай краіны. У прыватнасці, удакладняецца пералік суб'ектаў, на якіх ускладаецца абавязак інфармаваць органы ўнутраных спраў аб выдзяленні памяшканняў для пражывання замежнікам, якія часова прыбываюць на тэрыторыю Беларусі. У адносінах да асоб, якія не будуць выконваць гэты абавязак, прадугледжана адміністрацыйная адказнасць.

У цяперашні час парадак інфармавання органаў унутраных спраў аб замежных грамадзянах ускладзены на гасцініцы, санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі; суб'ектаў, якія аказваюць паслугі ў сферы аграэкатурызму, а таксама на юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія здаюць у арэнду жылыя памяшканні замежным грамадзянам.

«Правапрымяняльная практыка паказала, што асноўная частка замежнікаў прыбывае ў Беларусь з кароткатэрміновымі мэтамі і пражывае ў фізічных асоб, якія здаюць жылыя памяшканні па дагаворы найму, — адзначыў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ**. — Адпаведна дастаткова вялікі аб'ём звестак аб замежніках, якія пражываюць у памяшканнях, выдзеленых фізічнымі асобамі, не накіроўваецца ў органы ўнутраных спраў, бо ў апошніх няма такога абавязку. Толькі з дапамогай інфармацыйных рэсурсаў у 2022 годзе органы ўнутраных спраў атрымалі больш як 884 тысячы апавяшчэнняў аб замежніках, а за дзесяць месяцаў бягучага года — 863 тысячы апавяшчэнняў. З улікам сённяшніх рэалій адсутнасць такіх звестак можа неспрыяльна паўплываць на стан грамадскай бяспекі ў Рэспубліцы Беларусь».

Як падкрэсліў **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Сяргей СЫРАНКОЎ**, любая дзяржава прымае тыя ці іншыя рычагі ўплыву на міграцыйную сітуацыю зыходзячы з тых працэсаў, якія ўплываюць на пытанні нацыянальнай бяспекі. «Беларусь не з'яўляецца выключэннем, — удакладніў дэпутат. — Мы пастаянна ўдасканальваем наша заканадаўства. Гэтае рашэнне прадыктавана як унутранай палітычнай сітуацыяй, так і глабальнымі грамадска-палітычнымі працэсамі, што адбываюцца за межамі нашай краіны. Рашэнне выклікана і тым, каб паставіць бар'еры незаконнай міграцыі ў нашу краіну».

### КРЭДЫТЫ — ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

У першым чытанні разгледжаны праект Закона «Аб крэдытных гісторыях». Удасканаленне дзеючага заканадаўства звязана з імклівым развіццём лічбавізацыі, павышэннем узроўню абароненасці суб'ектаў крэдытнай гісторыі ад махлярскіх дзеянняў, а таксама недапушчэннем нядобрасумленнага выкарыстання крэдытных справаздач карыстальнікамі крэдытных гісторый.

Як расказаў **намеснік Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Віталь ВАСЮКОЎ**, пашыраецца пералік крыніц фарміравання крэдытных гісторый. «Сёння гэта банк або нябанкаўская фінансавая або мікрафінансавая арганізацыя, якая пры аказанні пэўнай паслугі перадае звесткі аб сваім кліенце (фізічнай або юрыдычнай асобе) у крэдытны рэгістр, — патлумачыў ён. — Цяпер, пашыраючы гэты пералік, сюды будуць уключацца юрыдычныя асобы, якія рэалізоўваюць сваю прадукцыю ў растэрміноўку. Напрыклад, гэта крамы, якія прадаюць мабільныя тэлефоны, камп'ютарную тэхніку, мэблю і гэтак далей. Новаўвядзенні дазволяць пашырыць звесткі аб асобе, якая бярэ тавар у крэдыт або ў растэрміноўку. Гэта мінімізуе рызыкі, звязаныя з аказаннем фінансавых паслуг, і абароніць спажыўцоў ад неабгрунтаваных фінансавых выдаткаў».

**Вераніка КАНЮТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Больш за два мільёны чалавек у сектары Газа маюць патрэбу ў тэрміновай харчовай дапамозе



Сама меней 2,2 мільёна чалавек у сектары Газа маюць патрэбу ў тэрміновай харчовай дапамозе. Аб гэтым заявілі ў Сусветнай харчовай праграме (СХП) ААН, паведаміла ТАСС. У заяве арганізацыі адзначаецца, што для таго, каб дапамагчы тым, хто мае патрэбу, СХП і партнёрам неабходны лепшы доступ і такія рэсурсы, як паліва, газ і сувязь. Арганізацыя мае намер аказаць харчовую дапамогу як мінімум 1,1 мільёна чалавек. Паводле яе ацэнак, дапамогу ўжо атрымала больш за 555 тысяч палестынцаў. Раней у арганізацыі заяўлялі, што з пачатку канфлікту ў сектар Газа паступае ўсяго 10 працэнтаў неабходнага харчавання.

### Германія падоўжыла сістэму кантролю на польскай граніцы

Сістэма кантролю на граніцы з Польшчай падоўжана яшчэ на 20 дзён, бо колькасць нелегальных уездаў у краіну скарацілася толькі цяпер — упершыню з лютага, паведаміў Euronews. У кастрычніку нямецкая паліцыя затрымала больш за 20 тысяч мігрантаў без дакументаў. Гэта на 1300 менш, чым у верасні. Усяго ж са студзеня па кастрычнік 2023-га колькасць нелегальных мігрантаў перавысіла 112 тысяч, што ўжо значна больш, чым у 2022-м. Нямецкія пагранічнікі могуць спыняць машыны, правяраць дакументы і наглядаць багажнікі. З сярэдзіны кастрычніка таксама ўведзены кантроль на пунктах перасячэння граніцы з Чэхіяй і Швейцарыяй.




### У Фінляндыі імкліва павялічваецца беспрацоўе




Згодна з дадзенымі Міністэрства эканамічнага развіцця і занятасці Фінляндыі, колькасць беспрацоўных, якія шукаюць работу, павялічылася на 23,7 тысячы чалавек з кастрычніка мінулага года. Пра гэта паведаміла фінская тэлерадыёкампанія Yle. У справаздачы міністэрства адзначаецца, што паралельна з ростам беспрацоўя ў краіне таксама адзначаецца скарачэнне колькасці працоўных месцаў. Усяго ў кастрычніку было адкрыта 102 тысячы вакансій, што на 58,6 тысячы менш, чым год таму. Агульная колькасць беспрацоўных у Фінляндыі на канец кастрычніка склала крыху больш за 256 тысяч чалавек. Гэта на 6,3 тысячы больш, чым у папярэднім месяцы.